СКАЎТЫ НАЗАЎЖДЫ

Карэспандэнт «Звязды» паўдзельнічаў у міжнародным злёце скаўтаў

Кліч «Будзь гатовы!», дзяленне на атрады, начлег у лесе ў палатках, збор ля вялікага вогнішча… Усё гэта вядома мільёнам людзей, якія ў дзяцінстве насілі чырвоны піянерскі гальштук. Аднак піянеры рытуалы і атрыбутыку шмат у чым запазычылі ў сваіх папярэднікаў — скаўтаў. Гэты моладзевы рух быў створаны ў далёкім 1907 годзе англійскім палкоўнікам сэрам Робертам Стывенсанам Смітам Бадэн-Паўэлам, а неўзабаве прыйшоў і ў Расійскую імперыю. За гэты час скаўты перажылі імклівы росквіт, татальную забарону ў сталінскія часы і адраджэнне ў часы перабудовы.

— Калі мы толькі пачыналі сваю справу чвэрць стагоддзя таму, то працавалі пераважна з дзецьмі, якія выхоўваюцца ў інтэрнатах. Мы імкнуліся іх нечым заняць, прызвычаіць да дысцыпліны. Крыху нам дапамог і палітычны крызіс пачатку 1990-х, калі магутнасць піянерскай арганізацыі пахіснулася. Бо піянеры тады былі для нас прамымі канкурэнтамі, — успамінае **старшыня Беларускай рэспубліканскай асацыяцыі скаўтаў Ігар КАСЦЕВІЧ**. — Сёння мы з імі супрацоўнічаем. Дапамагаюць нам таксама Чырвоны Крыж і Беларуская Праваслаўная Царква. Увогуле сучасны скаўт — гэта добры краязнаўца, эколаг і гуманіст…

10 скаўцкіх законаў:

— Скаўт мае гонар
— Ён верны
— Ён мусіць дапамагаць іншым
— Ён сябар усім
— Ветлівы
— Сябар жывёл
— Падпарадкоўваецца загадам
— Не здаецца пры любых цяжкасцях
— Беражлівы
— Ахайны і чысты ва ўчынках

«ВАЎЧАНЯТЫ» І «ВАВЁРАЧКІ»

Аднак юнак-скаўт мусіць быць дысцыплінаваным і мець добрую вытрымку. Выпрацаваць гэтыя якасці яму дапамагаюць разнастайныя цікавыя спаборніцтвы.

Адно з найбольш захапляльных выпрабаванняў носіць у скаўтаў назву «Тры пёры». Тут правяраюць вытрымку маладога чалавека. Першае пяро азначае поўнае маўчанне на працягу сутак, нягледзячы на ўсе спробы разгаварыць скаўта. Другое выпрабаванне — на голад. Яно таксама доўжыцца суткі. Але своеасаблівым «кантрольным стрэлам» лічыцца… рабінзанада. Скаўт мусіць правесці ў лесе роўна 24 гадзіны. З сабой ён можа ўзяць толькі цёплыя рэчы, спальнік, палатку, крыху ежы і паўтара літра вады. Можна прыхапіць з сабой і таварыша, аднак любыя спробы загаварыць з ім азначаюць непазбежную дыскваліфікацыю для абодвух — пільны кантроль за канкурсантамі вядзецца няспынна.

Скаўцкая форма незвычайная ў параўнанні са звыклай піянерскай.

Стаць жа скаўтам тэарэтычна можа кожны чалавек. Якіхсьці абмежаванняў па ўзросце няма — прымаюць як васьмігадовых хлапцоў, так і трыццацігадовых мужчын. Аднак тут скаўцкая кампанія дзеліцца на тры вялікія групы. Малыя ва ўзросце да дзесяці гадоў хутчэй адносяцца да падрыхтоўчай групы. Яны завуцца «ваўчанятамі» і «вавёрачкамі». Падлеткі аб'яднаны ў кадэцтва. А ўласна скаўцкае званне надаецца прыкладна гадоў у 15.

Скаўцкая арганізацыя хоць і нешматлікая ў параўнанні з піянерскай, але ўступіць у яе няпроста. Вырашальным крытэрыем адбору з'яўляецца рэкамендацыя ад сапраўдных членаў арганізацыі. Да таго ж узімку скаўты ў лес не ездзяць, а вывучаюць сваю справу ў тэорыі — як правільна распальваць агонь, завязваць моцныя вузлы, ставіць палатку… У праграме абавязкова стаіць вывучэнне гісторыі краіны ўвогуле і роднага краю ў прыватнасці. Менавіта таму са скаўтаў часта атрымліваюцца выдатныя следапыты. І калі навічок прыходзіць у гурток увосень, то за гэтыя месяцы становіцца бачна, хто ёсць хто. Пасля кіраўнікі дружын на адмысловай нарадзе вырашаюць, хто ж варты насіць званне скаўта. А ўсяго за чвэрць стагоддзя праз шэрагі гэтага руху на Беларусі прайшлі амаль 29 тысяч чалавек.

АГУЛЬНЫ ЗЛЁТ? ДЖАМБАРЫ!

Злёт скаўтаў з розных краін завецца для беларускага вуха нязвыкла — джамбары.

— Гэтае слова паходзіць з моў індзейцаў Паўночнай Амерыкі і азначае «збор усіх плямён». Раз на чатыры гады адбываецца сусветнае джамбары. Упершыню я трапіў на яго ў 1992 годзе. І быў уражаны тым, што ў лесе разгарнуўся сапраўдны горад з палаток — тады на яго з'ехаліся каля 35 тысяч скаўтаў са ста краін свету, — успамінае **дырэктар сярэдняй школы № 98 горада Мінска Юрый БАТУРА.** — Першае нацыянальнае джамбары прайшло сёлета ў ліпені. Каля двухсот чалавек з Расіі, Украіны, Арменіі і Беларусі сабраліся на дзевяць дзён на беразе возера Суя, што ў Полацкім раёне.

Гэты час яны жылі ў лесе самастойна, без татальнага кантролю з боку бацькоў. Важна, каб скаўт меў моцны духоўны стрыжань. І мы ставім перад сабой задачу максімальна развіць юнака ў духоўным і практычным сэнсе. Хаця першапачаткова скаўты былі створаны на ваенізаванай базе, каб падрыхтаваць падлеткаў да службы ў войску. З цягам часу мілітарысцкі складнік у праграме цалкам знік, аднак форма і атрыбутыка яго дагэтуль нагадвае англійскую ваенную стагадовай даўніны. Паўваеннае мінулае адчуваецца нават у назвах скаўцкіх груп. Так, калі ў піянераў ёсць звёны і атрады, то ў скаўтаў яны заменены на патрулі і дружыны. Прыналежнасць да іх лёгка вызначыць па адпаведных нашыўках. Назвы патрулёў гучаць для навічка нязвыкла — напрыклад, «Жоўты папугай», «Белы крумкач»… Ад назвы патруля будзе залежаць і колер гальштука, чаго няма, дарэчы, у піянераў.

Цікавы ў скаўтаў і распарадак дня. Напрыклад, сігнал пад'ёму гучыць у іх а восьмай раніцы. Прытым каманды адбою не існуе ўвогуле. Але па лагеры позна ўначы ніхто не бадзяецца.

За 25 гадоў кіраўніцтва я нагледзеўся на даволі анекдатычныя выпадкі, — прыгадвае Ігар Касцевіч. — Маці прывяла да нас узімку на заняткі сына-трэцякласніка. Той адразу спытаўся: «А ці можна ў паходзе глядзець тэлевізар і гуляць на камп'ютары?» Пачуўшы адмоўны адказ, сышоў. І смешна, і сумна адначасова…

ДЗЯЖУРНЫ НА ЎСЕ РУКІ

Яўген Міхалькевіч прыйшоў у скаўтынг чатырнаццацігадовым хлопцам. Зараз яму ўжо дваццаць, ён вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі.

— Больш за ўсё мне запомніўся мой першы паход на раку Уша, які традыцыйна адбываецца на майскія святы. Там мяне і прынялі ў скаўты. Аднак пра цырымонію я лепш прамаўчу, бо гэта — адна з найвялікшых таямніц руху. Але магу сказаць, што яна запамінаецца на ўсё жыццё…

За мінулыя шэсць гадоў я навучыўся якасцям сапраўднага лідара. Вось, напрыклад, зараз я дзяжурны па скаўцкім лагеры. Дзяжурны прызначаецца на суткі і нясе вахту дваццаць чатыры гадзіны без перапынку. Праца, шчыра кажучы, нялёгкая — трэба паўсюль паспець, трымаючы ў галаве адначасова з дзясятак розных пытанняў.

Скаўты займаюцца і дабрачыннасцю. Штогод яны ўдзельнічаюць у акцыі «Віфлеемскі агонь міру і сяброўства». Ад гэтага агню яны запальваюць лампадкі ў праваслаўных і каталіцкіх храмах Беларусі — месцах, куды людзі прыходзяць у пошуку міру, надзеі і цяпла. Скаўтам не ўласціва рэлігійная апантанасць. Але і мацёрых атэістаў яны ў сваіх шэрагах не вітаюць. Дастаткова проста схіліць галаву і памаўчаць на пастраенні, калі чытаюць малітву.

На жаль, бываюць і такія выпадкі, калі скаўт у нечым праштрафіўся. Тады яго чакае Суд гонару. Але нават выключэнне чалавека з радоў дружыны часта бывае толькі фармальнасцю.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота аўтара.

Скаўты Павел Рублеўскі і Ягор Карпук падчас спаборніцтва.

■ Крытыка на шпільцы

КНІГА ЯК ЦУД УЗНАЎЛЕННЯ

Апошнім часам дзіўлюся лёсу сучасных беларускіх кніг. З аднаго боку, выходзіць процьма самых разнастайных выданняў. З другога — надта кароткая да іх цікавасць. Нават самыя бліскучыя, выштукаваныя кнігі, якія пішуцца не адзін дзясятак гадоў, хіба на момант асвятляюцца промнем увагі пасля прэзентацыі ці ўручэння прэміі, а пасля зноў знікаюць у прыцемку гісторыі.

Са здзіўленнем пабачыла кнігу Вольгі Бабковай «…І цуды, і страхі. Эсэ па гісторыі штодзённасці Вялікага Княства Літоўскага XVI—XVII стагоддзяў» у кніжнай краме. Са здзіўленнем, бо кніга гэта настолькі незвычайная для Беларусі, што пра яе, як на мой погляд, павінны ведаць і гаварыць усе больш-менш адукаваныя людзі не адзін год. Кніга і была заўважана, адзначана, але далёка не ў той меры, як яна таго заслугоўвае.

Назва «…І цуды, і страхі» — цытата з кнігі Яна Баршчэўскага, заснавальніка нацыянальнага фэнтазі. Неверагодна, але назва цалкам адпавядае зместу кнігі.

Сама манера рэканструкцыі жыцця беларусаў XVI—XVII стагоддзяў — сапраўдны цуд, бо аўтар так паэтычна, пранікнёна ўзнаўляе побыт, праблемы і норавы людзей позняга Сярэднявечча і пачатку Новага часу на падставе судовых дакументаў, што міжволі ствараецца эфект прысутнасці. Як быццам ты ляціш на нейкім паветраным шары — не надта нізка, каб разглядзець твары людзей унізе, і не надта высока, каб мець магчымасць назіраць за іх дзеяннямі… І нават не ляціш, а плывеш, бо дзеянне разгортваецца павольна, з той павольнасцю, з якой толькі і можна глядзець на гісторыю, не губляючы дэталяў, у якіх і ёсць самы смак такога роду літаратуры…

Ты атрымліваеш магчымасць паглядзець на падзеі чатырохсотгадовай даўніны, пачуць каментарый даследчыцы, перасыпаны словамі, якія ты часта і не ўяўляў раней, і паразважаць над рэчамі, над якімі, хутчэй за ўсё, і не задумваўся, «закруціўшыся» ў сваёй паўсядзённасці: «Засненнем» называлі смерць у старабеларускай традыцыі. Бо пакідаючы свет *мизерны, адменны, прывидны, надзны, аблудны, нерозны,* чалавек свята верыў у абуджэнне, у вясёлае *Змёртвыхвстанне,* у сустрэчу адроджанага цела і вечнай душы (цікава, што панятак «душа» знайшоў зафіксаванне і ў судовай дакументацыі пры апісанні возным чарговага пацярпелага, маўляў… *убоства его забралі і пашарпалі так, што сам ледзь з душой утек…)».*

З вышыні палёту ты можаш назіраць стары Мінск, яго храмы і рынкі, замак і балоты… Але, па шчырасці, не надта і хочацца ў яго спускацца, бо стары горад — гэта, у першую чаргу, тэрыторыя страхаў. Дзе зусім рэальныя людзі, ад якіх засталіся, відаць, не толькі імёны, але і нашчадкі, маглі цябе беспакарана спаліць на вогнішчы, пазбавіць жытла і маёмасці, параніць шабляй без прычыны ці проста раструшчыць, папсаваць плён тваёй працы толькі з зайздрасці і злых думак. Шчыра кажучы, мне нават не ўяўлялася, наколькі жорсткі, бязлітасны — асабліва для ўдоў і дзяцей — быў сярэднявечны свет, дзе свае правы адстаяць не маглі часам нават заможныя людзі, не кажучы ўжо пра тых, каго купілі, ці ўзялі ў палон, ці атрымалі ў спадчыну. Чужое жыццё куплялася за капейкі, але не мела ніякай каштоўнасці ў вачах рабаўнікоў, злыдняў, душагубаў, якія папросту дзеля ўласнай коньмі, з зайздрасці труцілі суседзяў, ад залішняй сілы прымушалі лезці на сосны голымі ў мароз ці забівалі падарожнага за прыгожую шапку!

Тым, хто лічыць, што сёння грамадства стала больш жорсткім, чым тое, што было даўней, варта пачытаць сведчанні пра збіццё да смерці цяжарных жанчын і чужымі, і ўласнымі мужамі (збіццё, якое, як правіла, не заканчвалася пакараннем нават пры звароце ў суд, які ўжо тады, між іншым, спраўна працаваў з раніцы да ночы).

Тым, хто старанна выбудоўвае свае радавыя дрэвы, спрабуючы даказаць, што ён арыстакрат, «белая костачка», варта памятаць, што магнаты на Беларусі — з'ява далёка не адназначная. «Найбольш выразна сваю непрыхільнасць да ўлады магістрату выказвалі заезджыя магнаты са сваімі слугамі ды памагатымі. Урэшце, яны чынілі *великие и незносные крыўды* ўсяму месту, і, у абыход закону, хадзілі па горадзе *з ручніцамі, пулгакамі, лукамі,* разбіваючы па ўсіх вуліцах кабыліны, страляючы ў дамы і мардуючы жыхароў, *хлеб на рынку беручы и всякую живность в крамах, у ремесленников работу гвалтом».* Як сведчыць аўтарка-архівістка, не могучы больш трываць такога здзеку і крыўды, калі *«места Менскае нишчат и пустошат как в земли неприятельской»,* месцічы час ад часу згуртоўваліся і спрабавалі даваць адпор самі. Але не такое яно простае — змаганне са злом…

Як ужо можна бачыць з прыведзеных цытат, мова кнігі змяшчае як сучасныя формы, так і тыя, якія захавалі для нас тагачасныя дакументы. Аднак не варта баяцца, што кніга падасца вам вельмі цяжкай, нечытэльнай. Па-першае, у канцы яе ёсць невялікі тлумачальны слоўнічак, да якога я сама раз-пораз звярталася. Па-другое, кніга «…І цуды, і страхі» пры ўсёй сваёй паэтычнасці вельмі лагічна збудавана: першыя эсэ апісваюць стары Менск, пасля акрэсліваюць асаблівасці жыцця людзей розных нацыянальнасцяў (а наша сталіца ў той час была сапраўды мультыкультурнай), а потым звяртаюцца да пэўных ключавых момантаў жыцця — такіх, як вяселле, дарога, чарадзейства, маёмасць і скарбы.

Усе абрысы тагачаснага жыцця прапісаны Вольгай Бабковай з любоўю і да беларускай гісторыі, якую мы ўсе, так выглядае, слаба ведаем, і да самага мізэрнага чалавека, які, нават у сваёй нязначнасці, заўсёды пакідае пасля сябе часцінку, знак. Цудоўна, што ёсць людзі, якія тыя кволыя, паўсцёртыя знакі ўмеюць расшыфроўваць і распавядаць іншым — дзеля роздуму і навукі.

Ганна КІСЛІЦЫНА.

(Цытаты дадзены паводле аўтара кнігі).

■ Падзея

«Невядомая з кветкамі і садавіной» прыехала ў Магілёў

У Магілёўскай ратушы адкрылася выстаўка адной карціны. У экспазіцыі музея гісторыі Магілёва, які там месціцца, з'явіўся «Партрэт невядомай з кветкамі і садавіной» работы вядомага беларускага мастака Івана Хруцкага.

Любавацца на славуты твор магілёўцы змогуць увесь жнівень. Дырэктар музея гісторыі Магілёва Аляксей Бацюкоў паведаміў, што выстаўка адной карціны адкрываецца ў іх упершыню, а ідэя зрабіць такую акцыю належыць аддзелу культуры Магілёўскага гарвыканкама.

Гэтая карціна Івана Хруцкага датуецца 1838 годам. Прыгожая жанчына ў старадаўнім строі, шыкоўныя кветкі ў выкшталцонай вазе, смачна выпісаныя плады і ягады, напой у графіне. Нядаўна «Партрэт невядомай з кветкамі і садавіной» і іншыя выдатныя нацюрморты мастака сталі вядомымі шырокай публіцы, у тым ліку і за межамі Беларусі. Гэта адбылося дзякуючы серыі паштовак, прысвечанай творам з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея. Паштоўкі з рэпрадукцыямі з дапамогай пасткросінгу разлятаюцца па ўсім свеце і карыстаюцца папулярнасцю.

Ілона ІВАНОВА

■ Здарэнні

А ДАЗВОЛЬНЫХ ДАКУМЕНТАЎ НА ДЗІКА НЕ БЫЛО…

Работнікі Жлобінскай міжрайінспекцыі і ДПС АДАІ Жлобінскага РАУС спынілі для праверкі аўтамабіль. У багажніку ляжала туша дзіка з агнястрэльнымі раненнямі, карабін з аптычным прыцэлам і лямпай-фарай і 18 патронаў да яго. Дазвольных дакументаў на здабычу і перавозку дзічыны ні кіроўца, ні пасажыр прад'явіць не змаглі.

«Дзяржінспектары ўстанавілі, што жывёлу незаконна здабылі на сельскагаспадарчым полі паблізу вёскі Яшчыцы. Акрамя затрыманых, у незаконным паляванні бралі ўдзел егер мясцовай паляўнічай гаспадаркі, а таксама яго брат. У абодвух канфіскаваны чатыры гладкаствольныя паляўнічыя стрэльбы, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — У дачыненні да ўладальніка карабіна заведзена крымінальная справа за незаконнае паляванне, якое нанесла шкоду навакольнаму асяроддзю ў буйным памеры (60 базавых велічынь). Грошы парушальнік заплаціў у добраахвотным парадку».

СКРАЛА КАСМЕТЫКУ З КРАМЫ

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы вышукваюць дзяўчыну, якая з крамы па праспекце Незалежнасці скрала касметычныя сродкі на суму каля двух мільёнаў рублёў.

Увечары ў краму зайшла дзяўчына, доўгі час прагульвалася па зале, разглядаючы выстаўленую ў вітрынах касметыку. Падышоўшы да стэлажа з дэзадарантамі, наведніца цішком прыхавала ў сваю сумку тры флаконы, папярэдне зняўшы з іх ахоўныя прыстасаванні. Пераканаўшыся, што ніхто з прадаўцоў нічога не заўважыў, дзяўчына перайшла да наступнага стэлажа, дзе таксама непрыкметна прыхапіла частку тавару. Пасля гэтых маніпуляцый зламысніца пакінула краму. Прадаўцы не адразу зразумелі, што адбыўся крадзеж. Гэты момант зафіксавала камера відэаназірання.

Сяргей РАСОЛЬКА

Даты | Падзеі | Людзі

1781 год — зацверджаны герб горада Сянно — на зялёным полі дзве перакрыжаваныя залатыя касы (знак багацця сенам). Час узнікнення горада губляецца ў глыбокай старажытнасці. У пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца ў 1534 годзе. Горадам у розныя часы валодалі Сапегі, Агінскія, Корсакі, Копцы; у1757-м Сянно было прададзена Тышкевічам, якія падарылі яго Серакоўскім; затым перайшло ў валоданне Пуслоўскіх, а ў канцы XIX ст. стала ўласнасцю Шабекаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў 1941 годзе пад Сянно на працягу трох дзён праходзіла адна з найбуйнейшых танкавых бітваў у сусветнай гісторыі.

1820 год — нарадзіўся Джон Тындаль, англійскі фізік. «Каб убачыць карціну ў цэлым, яе стваральніку неабходна аддаліцца ад яе, а каб ацаніць агульныя навуковыя дасягненні якой-небудзь эпохі, пажадана паглядзець на іх з пункту гледжання наступнай», — сцвярджаў фізік. Гэта дзякуючы Тындалю мы ведаем, чаму ў неба блакітны колер. Прычына — так званы «эфект Тындаля», пры якім прамень святла, які рассейваецца, мае выгляд блакітнаватага конусу. Аптычныя даследаванні вучонага ляглі ў аснову сучаснай оптавалаконнай сувязі. Тындаль падтрымліваў працы Луі Пастэра па апрацоўцы харчовых прадуктаў, і сёння, акрамя пастэрызацыі, вядомая яшчэ і тындалізацыя — апрацоўка парай пры тэмпературы 100 градусаў па Цэльсію.

1947 год — нарадзіўся Валерый Міхайлавіч Гарохаў, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства, доктар тэхнічных навук (1997). Аўтар навуковых прац па парашковай металургіі і кампазіцыйных матэрыялах. Распрацаваў навуковыя асновы механікі незваротнага дэфармавання парашковых матэрыялаў у працэсах апрацоўкі ціскам.

Было сказана

Максім БАГДАНОВІЧ, паэт, перакладчык:

«Прага шчасця настолькі вялікая ў нас, што нават самыя шчаслівыя моманты, дні, тыдні, гады — часцей за ўсё здаюцца… уступам да шчасця».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.25	21.06	15.41
Віцебск	5.09	21.01	15.52
Магілёў	5.15	20.56	15.41
Гомель	5.18	20.46	15.28
Гродна	5.41	21.20	15.39
Брэст	5.48	21.14	15.26

Месяц

Апошняя квадра 29 ліпеня. Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *ПРАРОКА ІЛЫ, Абрама, Аляксандра, Апанаса, Георгія, Івана, Кузьмы, Сяргея, Фёдара, Ціхана.*
К. *Карыны, Марыі, Густава, Сцяпана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

У кожнай жанчыны ў шафе вісіць рэч на выпадак «а раптам я пахудзею».

Размова па тэлефоне:
— Добры дзень, а Каця дома?
— Не, Каці няма. З вамі размаўляе яе блакітнавокая даўганогая сястра.

Гарэлка, калі яе п'юць, розуму не дадае і не памяншае.

Яна толькі правярае — ці ёсць ён у прынцыпе.

— Вось Цукерберг, напрыклад. У яго ёсць чаму павучыцца!
— У якога Цукерберга?
— Ды ў любога Цукерберга!

Цікава, толькі ў нас грошы, якія адкладваюцца на «чорны дзень», траціць на вяселле?

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.275. Індэкс 63850. Зак. № 3247.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 1 жніўня 2013 года.